Источник: "Краязнаўчая газета" - 2014-07-10

# Адданасць часу

***22 чэрвеня споўнілася 95 гадоў з дня нараджэння беларускага пісьменніка, празаіка, нашага земляка – ураджэнца вёскі Жажэлка Івана Сіняўскага.***



Нарадзіўся Іван Іванавіч у сялянскай сям'і. Вучыўся ў Жажэлкаўскай пачатковай школе, потым у Смалявіцкай школе калгаснай моладзі, дзе ўрокі батанікі вёў Васіль Купрэвіч, які пазней узначаліў АН БССР.

У 1937 – 1941 гг. І. Сіняўскі – студэнт літаратурнага факультэта Мінскага педагагічнага інстытута, удзельнічаў у літаратурным гуртку.

З аўтабіяграфіі І. Сіняўскага:

*«... гэта былі гады творчага натхнення, ідэйнага і адукацыйнага росту, гады радасці і нягод. Тут сур'ёзна пачаў займацца літаратурай. Літаратурны гурток у тыя гады наведвалі студэнты Іван Грамовіч, Мікола Лупсякоў, Мікола Аўрамчык, Вера Палтаран, Аляксей Коршак і шмат іншых, якія потым сталі пісьменнікамі. У жніўні 1940 года газета "Літаратура і мастацтва" змясціла маё апавяданне "Шафа". У хуткім часе меркаваў надрукаваць яшчэ некалькі апавяданняў, але....*

*25 чэрвеня 1941 года мы, студэнты-выпускнікі, павінны былі здаваць апошні дзяржаўны экзамен па педагогіцы. Экзамен не адбыўся. Наляцеў нямецкі самалёт і скінуў бомбу на вучэбны корпус. Мы, хлопцы, пайшлі ў ваенкамат, каб стаць на абарону Айчыны са зброяй у руках. Але там ужо ішла поўным ходам эвакуацыя, і нам сказалі ісці ў Барысаў.*

*Больш за два тыдні давялося дабірацца з Мінска да ракі Бярэзіны. Гэта быў шлях пакут і жахаў. Тысячы людзей ішлі і ехалі на ўсход. Старыя, жанчыны, дзеці. Дзеці неслі дзяцей. Ішлі цяжка параненыя і хворыя, ішлі стомленыя, абяссіленыя. Ішлі глухімі, нябойкімі дарогамі, бо па магістралі Масква – Мінск паўзла ўжо фашысцкая армія. Людзі стараліся трымацца як найдалей ад магістралі, каб не чуць скрыгатанне танкаў, каб не так быць на віду ў фашысцкіх сцярвятнікаў, якія ад цямна і да цямна пасыпалі дарогі кулямётнымі чэргамі, бамбілі фугаскамі».*

І. Сіняўскі аўтар зборнікаў апавяданняў «У навальніцу», «Новая школа», «Піянерскі гальштук». Выдаў кнігі прозы «А вяселля не было», «Ой, рэчанька, рэчанька...» (1962), «Дабрадзейка», «На правым флангу», «Марка», «Вернасць», «Заряница» (1971), зборнік апавяданняў «Ахвяры кахання» (1999), раман «Вярыгі» (2001) і інш.

У творах нашага земляка на першым плане былі праблемы, што хвалявалі тагачасную вёску. У рамане «Дарога на Замлынне» асэнсоўваўся подзвіг народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Аповесць «На правым флангу» прысвечаная Герою Савецкага Саюза П. Купрыянаву. У лірычнай аповесці «Сінія ночы» (1986) расказвалася пра вёску напярэдадні калектывізацыі, аб любові селяніна да зямлі (усё гэта перадавалася праз успрыманне васьмігадовага хлопчыка). Апавяданні і аповесці І. Сіняўскага вызначаліся глыбокім веданнем жыцця вясковых дзяцей, іх псіхалогіі, мастацкім даследаваннем станаўлення характару школьнікаў. У 1959 годзе ён быў прыняты ў Саюз пісьменнікаў.

Апошнія гады жыў у г. Жодзіна. Памёр 15 верасня 2001 г.

**А. МАРОЗАЎ,**
**метадыст аддзела бібліятэчнага маркетынгу Смалявіцкай ЦРБ**